**Зінкевіч, А.** Імя мужнага воіна – назаўсёды ў сэрцах удзячных яго землякоў / А. Зінкевіч // Веснік Глыбоччыны. — 2012. — 8 снеж. — С. 2.

# ІМЯ МУЖНАГА ВОІНА – НАЗАЎСЁДЫ Ў СЭРЦАХ УДЗЯЧНЫХ ЯГО ЗЕМЛЯКОЎ

Сёлетнім летам у жыцці калектыву Карабоўскай сярэдняй школы, як, зрэшты, і ў жыцці многіх жыхароў Карабоўскага сельсавета адбылася вельмі значная падзея. Мясцовай установе адукацыі, у адпаведнасці з рашэннем раённага выканаўчага камітэта ад 17 ліпеня 2012 года (аб чым унесены адпаведны запіс у Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і прыватных прадпрымальнікаў), было прысвоена імя Рамана Іосіфавіча Мацеюна. Такім чынам, дзякуючы намаганням кіраўніцтва раёна, старанню і рупнасці настаўнікаў і вучняў, увекавечана памяць нашага мужнага земляка, воіна-інтэрнацыяналіста, выдатнага сына глыбоцкай зямлі. Такая пачэсная справа, безумоўна, мае свой лагічны працяг.

### *Хвалюючая сустрэча*

Да гэтага дня, да гэтага адказнага мерапрыемства школьнікі і іх педагогі рыхтаваліся вельмі сур'ёзна, з асаблівай адказнасцю і стараннем. Вядома ж, хваляваліся, бо ўпершыню сустракалі столькі гасцей, родных і блізкіх выдатнага чалавека, імем якога названа піянерская дружына, а цяпер і школа. Такая сустрэча на самой справе гістарычная. На яе з розных мясцін Беларусі завіталі браты Рамана Мацеюна – Іосіф, Багдан, Артур і Юрый, іх жонкі, сястра Міра, а таксама старэйшая дваюрадная сястр і хрэсная Рамана – Крысціна і пляменнікі Максім і Таццяна. Хаця тут, лічу неабходным, абмовіцца: у такім, значна пашыраным, складзе дружнае сямейства Мацеюноў ведьмі часта наведваецца ў родныя мясціны, у вёску Гулідава, а ў Карабоўскую школу, мусіць, упершыню.

Усе яны, як адзін, шануюць, берагуць бацькаўшчыну, спяшаюцца сюды, каб наведаць могілкі, дзе пахаваныя любімая матуля Марыя Ігнацьеўна і тата Іосіф Іосіфавіч. А родная вуліца ў Гулідаве, якая, дарэчы, носіць імя Рамана Мацеюна, бацькоўскі дом паранейшаму для кожнага з іх застаюцца надзейным прытулкам, самым утульным месцам на планеце, дзе забываюцца ўсе жыццевыя згрызоты, дзе адбываецца ачышчэнне ад пыльных жыццёвых шляхоў. Такімі іх выхавалі – адданымі дому і роду свайму, роднай зямлі. І гэтую вернасць сваю яны берагуць, як самае найкаштоўнейшае багацце ў свеце, і перадаюць з пакалення ў пакаленне.

Калектыў Карабоўскай СШ як належнае пераняў лепшыя напрацоўкі і традыцыі зачыненай некалі Гулідаўскай школы, беражліва стаў захоўваць памяць пра земляка, воіна-інтэрнацыяналіста Рамана Мацеюна, які вучыўся менавіта ў Гулідаўскай васьмігодцы...

Цёплая атмасфера сустрэчы ў Карабоўскай школе паланіла ўсіх яе ўдзельнікаў. Пасля экскурсіі па школе, якую правяла для гасцей в. а. намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце Алена Жыдко, усе сабраліся ў холе першага паверха, ля стэнда «Ценою мужества и чести», прысвечанага Раману Мацеюну. Затым прагучала літаратурна-музычная кампазіцыя, аўтары і выканаўцы якой вельмі пастараліся, каб іх шчырыя, пранікнёныя словы пра мужных воінаў-афганцаў, пра выдатных нашых землякоў кранулі сэрца кожнага.

## *«Знаете, каким он парнем был»*

Найбольшая радасць і шчасце для бацькоў выгадаваць дзяцей здаровымі, добрасумленнымі, – спагадлівымі, працавітымі. Марыя Ігнацьеўна і Іосіф Іосіфавіч сумелі ўкласці ўсю сваю любоў і сілы дзеля гэтага. Усе шасцера іх дзяцей выраслі сапраўднымі грамадзянамі, дастойнымі людзьмі, сталі: хто педагогам, хто журналістам, а хто вайскоўцам. Кожны з іх належным чынам зарэкамендаваў сябе ў прафесіі, з гарачым патрыятычным запалам рэалізуе сябе ў карысных справах. Гэтак жа годна прайшоў свой кароткі, усяго 29-гадовы, адрэзак зямной дарогі іх брат Раман Мацяюн.

Па ўспамінах родных, ён быў у сям'і адным з самых старанных, шчырых і працавітых, пяшчотна любячым сынам, чулым братам, надзейным сябрам. У школьныя гады захапляўся спортам, загартоўваўся, а таму не дзіўна, што паступіў у Віцебскі тэхнікум фізічнай культры. Пасля яго заканчэння ў 1977 годзе праходзіў тэрміновую армейскую службу ў складзе абмежаванага вайсковага кантынгенту ў Венгрыі, быў сувязістам, спецыялістам першага класа, выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Пасля дэмабілізацыі ў Вілейцы ўзначальваў ДСТ «Ураджай», а з 1982 года стаў кадравым ваенным. А таму, ён як грамадзянін, які прысягнуў на вернасць сваёй Айчыне, як належнае прыняў загад камандавання аб накіраванні на службу ў Афганістан.

У жніўні 1987 года, развітваючыся з жонкай і зусім маленькім сынам, з усімі роднымі, пакідаючы родную зямлю, ён быў поўны аптымізму і надзеі на хуткую сустрэчу.

– Ад'язджаў, як быццам хутка вернецца, – успамінае самы старэйшы з братоў – Іосіф. – З маленькім чамаданчыкам накіраваўся да трала самалёта. Мы з Мірай праводзілі яго тады. На развітанне махнуў фуражкай і...

Служыў Раман Мацяюн у Кабуле, а ў кастрычніку пры пералёце ў другую вайсковую часць, у г. Лашкардах, іх самалёт быў збіты. Загінулі 17 чалавек з 18, што знаходзіліся на борце. У іх ліку і Раман Мацяюн. Так абарвалася жыццё маладога, поўнага надзей і планаў, чалавека, выдатыага сына, мужа, брата, бацькі.

## *Едкі пах вайны*

Вестку пра тое, што Раман накіраваны ў Афганістан, самым далікатным чынам усе ўтойвалі ад матулі. Тлумачылі, што яго адправілі ў службовую камандзіроўку ў Манголію. Але «абман» дзяцей не здоўжыўся. Трымаючы ў руках ліст, першую пісьмовую вестачку ад сына, яна адразу адчула едкі, страшны пах вайны...

– Што ж вы мне не кажаце, – заплакала маці...

Наколькі цяжка быдо ўсведамляць гэта, ведала толькі мацярынскае сэрца. І можна толькі ўявіць, якой незагойнай ранай стала для яе апошняя вестка пра сына Рамана. А ў кароткім адрэзку часу паміж гэтымі весткамі было некалькі пісем з Афганістана, поўных адданай сыноўняй любві. Вось некалькі вытрымак з іх: *«Добры дзень, мае дарагія, мамачка і ўсе, хто зараз ёсць дома... Сёння ў мяне радасць, я атрымаў ваша пісьмо.»*

*«Мамачка, родная мая, я вельмі цябе прашу – не хвалюйся... Я буду часцей вам пісаць, каб вы за мяне не хваляваліся, добра?»*

*«...Ці пачалі капаць бульбу? І ці вырасла яна? Ці змалацілі ячмень? Ці ёсць сёлета хоць трохі яблыкаў? Тут нам часам даюць яблыкі, памідоры, вінаград. Ну, а маладой нашай бульбачкі пакаштую ў наступным годзе...»*

*«Вось ужо будзе месяц, як я паехаў. Час гэты прайшоў хутка... Больш за ўсе мне хочацца нашай вады з калодзежа.»*

***Толькі брацтвам моцным моцныя мы ўсе***

Тэма гераізму, мужнасці, праяўленай нашымі беларускімі хлопцамі, такімі, як і Раман Мацяюн, рэфрэнам гучала праз усю літаратурна-музычную кампазіцыю. І трэба было бачыць, з якой увагай слухалі школьнікі ўспаміны Артура Мацеюна, якому таксама давялося зведаць жахі афганскай вайны. Так распарадзіўся лёс, што ён, ваенны карэспандэнт, неўзабаве пасля гібелі брата адправіўся ў тое ж гарніла, у тую далёкую страну.

– Вельмі складана было ўсё гэта ўсвядоміць, – кажа Артур Іосіфавіч. – Рана душэўная пасля гібелі брата яшчэ краваточыла. Але іменна там, на вайне, я зразумеў, што такое армейскае брацтва, афіцэрскі гонар і сумленне… Сэрца, безумоўна, рвалася на тое месца, дзе ўпаў мой брат. Мне пашчасціла сустрэцца і паразмаўляць з яго баявымі сябрамі, даведацца яшчэ больш пра яго баявыя будні.

А колькі ў памяці маёй засталося незабыўных сустрэч з землякамі, з гераічнымі нашымі глыбоцкімі хлопцамі. Нечаканай і надзвычай прыемнай была сустрэча з мужным сапёрам Ігарам Федаровічам, ураджэнцам Карабоўскага сельсавета, былым вучнем Карабоўскай школы…

Іх подзвіг там, у чужой краіне, павінен быць увекавечаны ў нашай памяці назаўсёды. І мне, і ўсім нам вельмі прыемна, што Карабоўскай школе прысвоена імя Рамана Мацеюна. Бязмерна ўдзячны і кіраўніцтву раёна, і вам, дарагія настаўнікі і вучні, за вашу працу, за ваш клопат па захаванні памяці пра нашага незабыўнага брата. Хачу запэўніць, цяпер мы яшчэ часцей будзем бываць у вас і дапамагаць у стварэнні пакоя памяці воіна-інтэрнацыяналіста.

Артур Іосіфавіч падарыў школе сямейную рэліквію – вучнёўскі дзённік Рамана Мацеюна і двухтомнік «Памяць. Горад Віцебск», дзе, дарэчы, змешчаны і артыкул пра яго.

Ад імя педагогаў і вучняў дырэктар установы Таццяна Гаўрылава запэўніла вялікую радню мужнага воіна, што калектыў прыкладзе ўсе намаганні, каб быць дастойнымі свайго земляка і ставіць перад сабой вельмі пачэсную і важную задачу: захаваць памяць пра Рамана Мацеюна і перадаць яе наступным пакаленням.

**Анатоль Зінкевіч**